

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 3 (188) 31 кастрычніка 1992 года


## *НАШЫ ГОСЦІ — ВУЧОНЫЯ ЗША*

**У апошні час наш універсітэт прыцягвае ўвагу вучоных і спецыялістаў з розных краін свету. Завязваюцца знаёмствы, заключаюцца дагаворы аб супрацоўніцтве.**

**Вось і нядаўна нашымі гасцямі былі вучоныя са Злучаных Штатаў Амерыкі — дырэктар Міжнароднага камітэта малога бізнесу, прафесар універсітэта г. Дайтон Эўген Г. Гамолка і эксперт лабараторыі менеджмента універсітэта Мэрыленд у г. Балціморы Дзіяна Марыя Гамолка. Мэта іх прыезду — падпісанне дагавору аб сумеснай падрыхтоўцы і перападрыхцоўцы кадраў у сферы кіравання бізнесам.**



Праграма візіту была надзвычай насычанай. На працягу трох дзён амерыканскія навукоўцы мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з Гродзенскім універсітэтам, сустрэліся з прафесарска-выкладчыцкім саставам, прадпрымальнікамі г. Гродна, наведалі біржу «Гродна — Захад», сельскагаспадарчае прадпрыемства «Прагрэс» Гродзенскага раёна, зрабілі экскурсію па гістарычнаму цэнтру горада.

Рэктар А. В. Бадакоў, прарэктары А. І. Васкабоеў і В. П. Таранцей у час сустрэчы расказалі гасцям аб сістэме адукацыі ў нашай рэспубліцы, навучальным працэсе, падрыхтоўцы кадраў і перспектывах развіцця нашага універсітэта.

Цікавай і змястоўнай была сустрэча са студэнтамі і выкладчыкамі факультэта правазнаўства на аддзяленні «Міжнародныя эканамічныя адносіны і міжнароднае права».

У сярэдзіне лістапада чакаецца новы візіт навукоўцаў з ЗША, у ходзе якога будуць падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве, прачытаны лекцыі, праведзены семінар на тэму падрыхтоўкі ўпраўленчых кадраў для сферы прадпрымальніцтва, бізнесу і фінансаў.

**В. ВЕРАС.**

**НА ЗДЫМКАХ: Э. Г. Гамолка і Д. М. Гамолка (справа) у час сустрэчы ва універсітэце; госці з ЗША з кіраўніцтвам універсітэта.**

**Фота У. СОРОКІНА.**




## *У абарону сваіх правоў*

Незвычайны мітынг адбыўся 19 кастрычніка, напярэдадні чарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі, на плошчы імя Леніна ў Гродне. На гэты раз сюды прыйшлі педагогі — настаўнікі школ, выкладчыкі ВНУ, тэхнікумаў, вучылішчаў горада, каб абараніць свае сацыяльныя правы. Сярод удзельнікаў мітынгу былі і работнікі нашага універсітэта. Адзначалася, што сёння педагог апынуўся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, узровень яго заработнай платы застаецца вельмі нізкім.

У прынятай пастанове ўдзельнікі мітынгу прыцягнулі ўвагу дэпутатаў да факта невыканання ўрадам пастановы Вярхоўнага Савета аб увядзенні пункта 7 артыкула 34 Закона аб адукацыі і выказалі нязгоду з дзеяннямі ўрада аб паэтапным павышэнні заработнай платы. Выказаны недавер Вярхоўнаму Савету, ураду і Дзяржкамітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва. Калі не будуць выкананы патрабаванні педагогаў, яны вырашылі з 1 лістапада аб 'явіць перадзабастовачны стан.

*Інтэрв 'ю у нумар*

### *Гродна — Пекін:*

## ГРАНІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

КІТАЙ... КРАІНА ВЯЛІКАЯ І ДАЛЕКАЯ, ЗАГАДКАВАЯ І КАЗАЧНАЯ. ХТО З НАС НЕ ВЕДАЕ, ШТО ГЭТА РАДЗІМА ПАПЕРЫ, ПОРАХУ, ФАРФОРУ І КІТАЙСКАЙ СЦЯНЫ. ЦЭНТР ЗЯМЛІ — ТАК КАЗАЛІ АБ ІМ У ДАЎНІНУ. НАСЯЛЯЮЦЬ ЯГО НАДЗВЫЧАЙ ПРАЦАЛЮБІВЫЯ І ГАСЦІННЫЯ ЛЮДЗІ. ЗА ШМАТВЯКОВУЮ ГІСТОРЫЮ КІТАЙСКІ НАРОД ЗВЕДАЎ І РОСКВІТ, І НЯСТАЧУ, І ВЯЛІКІЯ РЭВАЛЮЦЫІ, І ШМАТ ІНШЫХ УЗРУШЭННЯЎ. НАШЫ ЛЮДЗІ ПАМЯТАЮЦЬ ЯШЧЭ ГАДЫ «ВЯЛІКАЙ ДРУЖБЫ І УЗАЕМАДАПАМОГІ». НА ЗМЕНУ ІМ ПРЫЙШОЎ ПЕРЫЯД ХОЛАДУ, НЕПАРАЗУМЕННЯ.

ПРАЙШОЎ ЧАС, ЗМЯНІЛІСЯ ЛЮДЗІ, ІНШЫМІ СТАЛІ НАШЫ АДНОСІНЫ. ДЗЯКУЮЧЫ ЭКАНАМІЧНЫМ РЭФОРМАМ, КІТАЙ СЁННЯ ПРЫВАБЛІВАЕ ДА СЯБЕ БІЗНЕСМЕНАЎ, ТУРЫСТАЎ І СПЕКУЛЯНТАЎ. НА НЕБАСХІЛЕ «З 'ЯВІЎСЯ НОВЫ «ЭКАНАМІЧНЫ ЦУД» — КІТАЙ, ЗДЗЕЙСНЕНЫ ТУТ ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ.

МЕНАВІТА ГЭТЫМ ЭКАНАМІЧНЫМ ЦУДАМ І ЗАЦІКАВІЛІСЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ. І ВОСЬ У ЖНІЎНІ Г.Г. ДЭЛЕГАЦЫЯ НАШАЙ ВОБЛАСЦІ НАВЕДАЛА ГЭТУЮ КРАІНУ. У ЯЕ САСТАВЕ БЫЎ ПЕРШЫ ПРАРЭКТАР НАШАГА ЎНІВЕРСІТЭТА, ПРАФЕСАР А. І. ВАСКАБОЕЎ. АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ АХВОТНА ЗГАДЗІЎСЯ ПАДЗЯЛІЦЦА СВАІМІ ЎРАЖАННЯМІ АБ ПАЕЗДЦЫ, ПЕРАМОВАЎ, ЯКІЯ ВЯЛІСЯ З КІТАЙСКІМІ КАЛЕГАМІ.

**— АЛЯКСАНДР Іванавіч, для нас Кітай — гэта краіна не толькі далёкая, але і невядомая. Якія працэсы праходзяць там? Чым была выклікана ваша паездка і што прывезлі адтуль?**

— Сёння ў Кітаі даволі інтэнсіўна і паспяхова ідуць эканамічныя рэформы, адбываюцца змены ў палітычным і культурным жыцці. На арэну выходзіць новае пакаленне, якое імкнецца пазбавіцца ад грузу канфрантацыі і непаразумення, што назіралася ў гады «культурнай рэвалюцыі». Сцвярджаюць, што Кітай рухаецца да капіталізму, але сваім шляхам. Праз сацыялістычную сістэму, праз дзяржаўны кантроль і планаванне. Шырокае ўкараненне атрымліваюць розныя формы гаспадарання. Уздым назіраецца на ўсіх прадпрыемствах, у даследчых інстытутах.

А нашу дэлегацыю зацікавіла магчымасць стварэння су-

**(Працяг на 2 стар.).**

## НАВУКОВЫЯ КАНТАКТЫ

Факультэт беларускай філалогіі і культуры нашага універсітэта актыўна супрацоўнічае з ВНУ Польшчы. Выязджалі з дакладамі ў Рэспубліку Польшчу дэкан факультэта дацэнт І. Жук, загадчык кафедры беларускай культуры прафесар А. Пяткевіч і член гэтай кафедры прафесар С. Габрусевіч.

На канферэнцыі «Праблемы развіцця славянскіх моваў і літаратуры», якая адбылася летась у філіі Варшаўскага ўніверсітэту ў Беластоку, выступілі загадчык кафедры мовазнаўства прафесар П. Сцяцко з дакладам «Беларуска-польскія лексічныя ўзаемакантакты» і загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт К. Лецка з дакладам «Творы беларускіх пісьменнікаў, надрукаваныя на польскай мове».

25 красавіка гэтага года прафесар П. Сцяцко прыняў удзел у рабоце 50-га з 'езду польскіх мовазнаўцаў, на якім выступіў з паведамленнем пра беларускую антрапаніміку. Павел Уладзіміравіч чытае таксама ў Беластоцкай філіі Варшаўскага універсітэту курс лекцый па супастаўляльнай граматыцы славянкіх моваў і вядзе практыкум са студэнтамі 3-га курса гэтай ВНУ, а дацэнт К. Лецка — курс літаратуры Беларусі.

Прафесар П. Сцяцко, як член міжнароднага Камітэта беларусістаў і старшыня Гродзенскай нацыянальнай суполкі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў запрошаны на славістычную канферэнцыю «Культура ўсходняй тэрыторыі Польшчы» (Беласток, 22—23 лістапада 1992 года), дзе ён выступіць з дакладам «Этналінгвістычныя кантакты беларускага і польскага народаў».

**С. ПАЎЛОЎСКІ.**

## *Гродна — Пекін:*

*Інтэрв'ю у нумар*

# ГРАНІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

месных беларуска-кітайскіх прадпрыемстваў па пашыву спартыўнага адзення, абутку, пухавікоў і іншых рэчаў, так неабходных сёння нашаму чалавеку. Вось чаму ў складзе дэлегацыі былі два старшыні калгасаў і два галоўныя інжынеры з прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Я ў сваю чаргу цікавіўся і станам адукацыі і навукі ў гэтай краіне, у прыватнасці ў Пекінскім універсітэце. На працягу дзесяці дзён пабывалі на шэрагу прадпрыемстваў, устаноў, ВНУ, сельгаскааператываў, і, безумоўна, заключылі дагаворы на супрацоўніцтва.

**— Калі гэта не камерцыйная тайна, скажыце, што будзе пабудавана, калі выйдзе першая прадукцыя?**

— Сакрэтаў няма. У Астравецкім раёне будзе адкрыта прадпрыемства па выпуску пухавікоў і паліто. Думаю, што многія ўзрадуюцца гэтай навіне. У Гродзенскім раёне адкрыецца вытворчасць па перапрацоўцы пуху, а ў Гомельскай вобласці будзе наладжаны выпуск спартыўнага адзення. Ішла размова і аб вырабе абутку, але пакуль рашылі пачакаць. Лічу, што мы паступаем правільна, калі заключаем дагаворы аб пастаўцы новых тэхналогій і машын, а не абмяжоўваемся закупкай тавараў. Праз невялікі адрэзак часу будзем мець уласную вытворчасць. Дарэчы, пастаўляць новыя тэхналогіі будзе прадпрыемства, якое знаходзіцца ў сістэме Міністэрства касмічнай прамысловасці і Акадэміі навук.

**— А чаму кітайцы ахвотна пайшлі на кантакт з намі, як будуюць яны свае ўзаемаадносіны з партнёрамі?**

— Кітайцы вельмі насцярожана падыходзяць да стварэння сумесных прадпрыемстваў у былых саюзных рэспубліках СССР. Хаця актыўна ідуць на кантакты з заходнімі фірмамі. Яны ўстрывожаны нестабільнасцю сітуацыі ў рэгіёнах, негатыўна адносяцца да «савецкага вопыту» пераходу да рынку. З усіх рэспублік хацелі б супрацоўнічаць толькі з Беларуссю і Казахстанам. У Кітаі, дарэчы, вельмі жорсткі кантроль дзяржавы над вытворчасцю і цэнамі, чаго няма ў нас. За 10 гадоў рэформ дасягнуты ў эканоміцы парадак і дысцыпліна. Лічу, калі б не было такога кантролю, вынік быў бы такі, як у нас. Шмат у іх прыватных магазінаў і гандлёвых кропак, бытовак. Зразумела, рэгуляванне цэнаў неабходна. Асаблівы кантроль наладжаны за якасцю тавараў народнага ўжытку. Вельмі развіта сфера абслугоўвання. Кліент заўсёды правы — такі дэвіз іх працы. У магазіне, бытоўцы, рэстаране вас ніколі не падмануць, бо гэта не прынята. Калі ў нас сфера паслуг на грані развалу, там яна паспяхова развіваецца.

**— ВЫ СКАЗАЛІ пра магазіны. Чые яны, дзяржаўныя, прыватныя, ці можна ў іх што купіць? І ўвогуле, няўжо там усё добра?**

— Вельмі шмат там камерцыйных і прыватных магазінаў. Паліцы ломяцца ад тавару, прадуктаў. За кароткі час рэформ тут змаглі пераадолець цяжкасці, насыціць рынак. Зрэшты, тавары ў большасці айчынныя. Замежныя інвестары ахвотна ўкладваюць грошы ў кітайскую эканоміку. Настрой у кітайцаў аптымістычны, рэформы Дэн Сяопіна ідуць паспяхова. У Кітаі адказаліся ад рэзкіх скачкоў, ад вялікіх рэвалюцый і ломак, а ідуць эвалюцыйным шляхам. Дарэчы, рэфармуецца і сама партыя — вядучая сіла ў грамадстве. Аб гэтым сведчаць і вынікі апошняга яе з ´езда. Партыя адказалася ад ранейшых ідэалагічных догм. На вуліцах няма лозунгаў, партрэтаў, радзей праводзяцца сходы.

Растуць прадукцыйнасць працы, нацыянальны даход, заработная плата. Кітайцы дасягнулі небывалых тэмпаў прыросту — у гэтым годзе 16 працэнтаў. Нам бы гэты паказчык! Цэны ў іх не скачуць, як у нас зараз.

І ўсё ж цяжкасцей хапае. Ёсць беспрацоўныя, хаця гэты паказчык невялікі. Ёсць праблемы з нараджальнасцю, уведзены абмежаванні ў колькасці дзяцей у сям ´і. Пры з ´яўленні другога дзіцяці бацькі атрымліваюць штраф, а трох і больш — могуць страціць працу.

Дарагое жыллё, у дамах амаль адсутнічае гарачая вада. На заводах, дзе мы былі, цяжкія ўмовы працы, мала прыстасаванняў і новых механізмаў. Шмат бруду ў невялікіх гарадах, да іх, як кажуць, яшчэ рукі не дайшлі. А ўвогуле, кітайцы вельмі беражлівыя, на ўліку кожны кавалак зямлі. Здзіўляе вялікая колькасць веласіпедыстаў на вуліцах і дарогах, што прыводзіць нярэдка да аварый і траўм.

**— Аляксандр Іванавіч, нашых чытачоў зацікавіць, вядома, як развіта адукацыя ў гэтай краіне, падрыхтоўка спецыялістаў. Мы здаўна ведаем, што кітайцы любяць працаваць, вучыцца.**

— У Кітаі цэняць і паважаюць адукаваных людзей, ствараюць ім усе ўмовы для працы, вучобы. Расце духоўны і інтэлектуальны патэнцыял навукі. Стараюцца не дапусціць «уцечкі мазгоў», запрашаюць з-за мяжы назад вучоных кітайскага паходжання.

Высокія патрабаванні прад ´яўляюцца да студэнтаў. Асабліва гэта прыкметна ў Пекінскім універсітэце пасля сумнавядомых падзей 1989 года. Яны на працягу двух-трох гадоў павінны даказаць сваю палітычную, працоўную падрыхтоўку, свае адносіны да перамен. Калі чалавек не апраўдвае надзей, яго адлічваюць. У Кітаі, дарэчы, класічная сістэма адукацыі, шматузроўневая. Здзівілі нас адносіны да педагагічных кадраў, іх цэняць і паважаюць, добра плоцяць. Прафесару, іншым выкладчыкам устаноўлены вялікія надбаўкі, і заробак іх намнога перавышае наш. Прафесар ВНУ Кітая, напрыклад, абавязкова павінен ведаць дзве замежныя мовы. Думаю, не шкодзіла б і ў нас увесці такое правіла.

**— І НАРЭШЦЕ такое пытанне. Як ставяцца кітайцы да нас, рускіх, беларусаў, словам савецкіх. Ці прайшоў стан «халоднай вайны» і нядобразычлівасці? Прапаганда ў Кітаі, ведаем, добра развіта.**

— У цэлым адносіны добрыя, хаця ў людзей рознага ўзросту гэта праяўляецца па-рознаму. Больш сталыя людзі радушныя, добразычлівыя да нас, шкадуюць, што развалі́ўся Савецкі Саюз, перажываюць за нашы цяжкасці. Больш насцярожаны да нас людзі сярэдняга ўзросту. Яны лічаць, што «Саветы — здраднікі». У маладога пакалення больш інтэрнацыянальнае мысленне, іх менш цікавіць палітыка, ідэалогія, для іх галоўнае — гандляваць. Яны сцвярджаюць, што ў гандлі не бывае ворагаў ці сяброў, а ёсць пастаянны інтарэс. А зрэшты, моладзь у Кітаі, як і ў нас, імкнецца жыць па-новаму, па-еўрапейску. Хаця свае нацыянальныя традыцыі захоўваюцца. Ёсць і суровыя абмежаванні ў паводзінах, звычках. Дарэчы, маладыя кітайцы адчуваюць дысцыпліну, менш хуліганяць. Правілам дрэнных паводзін лічыцца наведванне чужога чалавека ў гасцініцы. У нас, на жаль, наадварот, ёсць выпадкі, калі асобныя жыльцы гасцініц водзяць на ноч 14—15-гадовых дзяўчынак.

Думаю, у перспектыве мы маглі б заключыць дагавор аб супрацоўніцтве з якой-небудзь ВНУ Кітая, навучаць у сябе іх прадстаўнікоў, абменьвацца выкладчыкамі.

Дадам у заключэнне, што Кітай — цікавая краіна і нам варта было б вучыцца адзін у аднаго.

**Гутарыў У. АМЕЛЬКА.**

# ЛЕТНІ

**ВОСЬ І ЗАКОНЧЫЛІСЯ ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ. І ЗНОЎ АЎДЫТОРЫІ І КАЛІДОРЫ УНІВЕРСІТЭТА ЗАПОЎНІЛІСЯ ГАЛАСАМІ І СМЕХАМ СТУДЭНТАЎ. ПАЧАЛАСЯ ЦЯЖКАЯ І КАРПАТЛІВАЯ ПРАЦА ПА АВАЛОДАННЮ ВЕДАМІ. ГАЛОВЫ БУДУЧЫХ МАЛАДЫХ ГУМАНІТАРЫЯЎ І ПРАДСТАЎНІКОЎ ТЭХНІЧНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ПЕРАПОЎНЕНЫ НОВЫМІ ПРАБЛЕМАМІ, ЗВЯЗАНЫМІ З ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСАМ. АЛЕ ДЛЯ МНОГІХ З ІХ ДОЎГА БУДУЦЬ У ПАМЯЦІ ЛЕТНІЯ МЕСЯЦЫ, ЦУДОЎНАЯ ПАРА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ.**

Дзесяткі маіх аднакашнікаў праходзілі сёлета летнюю практыку ў дзіцячых аздараўленчых лагерах горада і вобласці. Працуючы ў якасці выхавацеля або яго памочніка, многія з нас упершыню сутыкнуліся з тымі цяжкасцямі, якіх на долю педагога прыходзіцца нямала. І ў многіх з практыкантаў не раз узнікала думка аб правільнасці выбару будучай прафесіі.

А для таго, каб над гэтым задумацца, было шмат прычын. Бо, прыязджаючы на працу ў лагер, студэнт-практыкант сутыкаўся з выхаванцамі, якія прыйшлі з розных сацыяльных груп, якія па-рознаму выхоўваліся ў сем ´ях і мелі, безумоўна, розныя інтарэсы. І, робячы першыя крокі на педагагічнай ніве, практыкант адразу выяўляў свае слабыя бакі. А садзейнічалі гэтаму самі дзеці, якія вельмі хутка рэагуюць на ўсе яго пралікі. Вось тут і пачынаецца барацьба за «выжыванне». Або новаспечаны выхавацель праявіць максімум энтузіязму і выдумкі, зацікавіць дзяцей новымі ідэямі і справамі, а не набіўшымі аскоміну конкурсамі «Містэр лагера», «А ну, дзяўчаты!», «Два капітаны», або дзеці, улавіўшы яго слабінку як педагога, убачыўшы яго няўменне быць патрабавальным у пэўнай сітуацыі, «сядуць на шыю», а затым павядуць яго за сабой на павадку.

Зыходзячы са свайго вопыту, хачу параіць новай змене практыкантаў: дайце адразу зразумець сваім выхаванцам, што вы можаце быць цвердым і патрабавальным, што ўсё ў атрадзе залежыць ад вас. І ніколі не дазваляйце сабе грубасці, зазнайства і прыніжэння дзяцей. Лепш зрабіце ўсё так, каб яны адчулі ў вас «свайго чалавека».

Але гэта толькі адзін бок справы. Бо акрамя дзяцей ёсць у лагеры і адміністрацыя, і абслугоўваючы персанал. Як весці сябе з імі, вопытнымі педагогамі? Менавіта тут правяраюцца чыста чалавечыя якасці і здольнасці маладога педагога. Гэта і ўменне выслухаць і прааналізаваць заўвагу ці пажаданне старэйшага калегі, і ўменне знайсці выхад з канфліктнай сітуацыі, і здольнасць карэктна адстойваць сваю пазіцыю. Словам, у даным выпадку правяраецца здольнасць чалавека «прыжыцца» ў працоўным калектыве.

Але ўся складанасць працы студэнтаў у лагеры не заключаецца толькі вырашэннем канфліктных сітуацый. На жаль, паняццe «дэфіцыт» з ´явілася і ў сістэме летніх лагераў. У некаторых лагерах, дзе слабая матэрыяльная база, работа звязана з вялікімі цяжкасцямі. Бывае, што цяжка знайсці нават простую канцылярскую сашчэпку, фарбу, паперу і іншае. Але ёсць і такія лагеры, у якіх усяго хапае. Паехаць туды на практыку — мара кожнага.

Хачу таксама засяродзіць увагу кіраўніцтва універсітэта і супрацоўнікаў кафедры на тым, што немагчыма зрабіць з нас больш-менш добрых педагогаў-выхавацеляў лагера за тры дні спецыялізаваных збораў у будынку былога абласнога Палаца піянераў. Нам трэба хаця б на тыдзень выязджаць у абласныя лагеры і там вучыцца працаваць з дзецьмі-школьнікамі. Безумоўна, гэта няпроста, але трэба знайсці сродкі для фінансавання такіх мерапрыемстваў.

## *БЫВАЙ, ВЯСЁЛАЕ ЛЕТА!*

**Андрэй КЛІМОВІЧ,**
**студэнт 4-га курса аддзялення паланістыкі філалагічнага факультэта.**



# *БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?*

*Інтэрв'ю у нумар*

**СЁННЯ ГЭТА ПЫТАННЕ ПАЎСТАЛА ПЕРАД ФОНДАМ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕНАСЦІ СТУДЭНТАЎ І МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА. ХТО Ж БУДЗЕ ВЫРАШАЦЬ ГЭТУЮ ПРАБЛЕМУ? ДУМАЮ, ШТО ГЭТА ПЫТАННЕ АДНОСІЦЦА НЕПАСРЭДНА ДА РЭКТАРАТА.**

На сённяшні дзень у ФСАСіМС шмат праблем. Як выжыць? На жаль, многія ставяць гэта пытанне па-іншаму: ці патрэбен такі фонд нашаму універсітэту наогул? Што дае ён студэнтам? Таму я звярнулася з такім пытаннем да старшыні Фонда Валерыя Філіпчыка. У яго словах гучала горыч, але відаць, што ён не апускае рук. За чатыры гады вучобы ва універсітэце ён так прывязаўся да Саюза моладзі, у якім ён працаваў старшынёй штаба працоўных спраў, а потым у ФСАС, што ўсе студэнцкія праблемы лічыць сваімі праблемамі. І трымаюць яго там якраз не грошы... Валера не лічыць, што Фонд нікому не патрэбен. Гаворыць, што так лічаць тыя, хто ні разу не прыйшоў да іх, хто сам нічога не зрабіў.

— Справа тут вядомая, усё ўпіраецца ў грошы. Сёлета на гэты конт паўстала шмат праблем. Мы думалі, што ў гэтым годзе 50 працэнтаў грошай, зробленых студэнтамі на сельскагаспадарчых

(Працяг на 4-й стар.)

# СЕМЕСТР ПЕДАТРАДА

## Роздум на актуальную тэму

Цяжка знайсці сярод вас, шаноўныя чытачы газеты, чалавека, які хоць раз не пабываў у летнім лагеры. Праўда, раней ён называўся піянерскім, а цяпер па вядомым прычынам — аздараўленчым. І хоць начальнікі лагераў, якія хутка змянілі сваю палітычную арыентацыю, з гонарам гавораць, што піянерамі ў іх лагеры і не пахне, што ўкараніліся новыя, дзіўна перадавыя формы выхаваўчай работы, не верце ім — яны хітруюць. За нязначнымі зменамі выразна праглядваецца ўсё той жа «савецкі» лагер з усімі, толькі яму ўласцівымі атрыбутамі. Ды інакш і быць не можа — занадта малы тэрмін для пераўтварэнняў, занадта мала па-новаму думаючых і працуючых педагогаў, занадта цяжкія, а часам і неадольныя матэрыяльна-фінансавыя цяжкасці, якія ўзніклі ў апошні час.

Але, што самае цікавае і дзіўнае, дзецям, таксама як многа гадоў назад іх бацькам, вельмі падабаюцца дні, праведзеныя ў лагерах, як бы модна яны не называліся і якія бы змены ў іх не праходзілі.

У гэтым годзе, як і многа гадоў назад, летнюю выхаваўчую практыку праходзілі студэнты трэціх курсаў. Без перабольшання можна сказаць, што гэта практыка — адна з самых цяжкіх. Перш за ўсё, яна першая. Акрамя гэтага яна праходзіць у форме максімальна самастойнай педагагічнай дзейнасці у складаных умовах аўтаномнай працы дзіцячага лагера. Студэнт адначасова з ўяўляецца вучнем, які асвойвае азначаныя ўменні, і самастойна працуючым педагогам. Ён нясе поўную маральную і юрыдычную адказнасць за жыццё і здароў´е дзяцей (а гэта вельмі непроста ў іх узросце). Даны від практыкі складаны і для педагогаў яе курыруючых — складана аказваць дзейсную дапамогу, ды і проста наладзіць кантроль з-за аддаленнасці лагераў адзін ад аднаго.

Разам з тым, цяжка пераацаніць значэнне данага віда практычнай падрыхтоўкі будучых педагогаў. За кароткі тэрмін студэнты набываюць разнастайныя навыкі, першы педагагічны вопыт, ацэньваюць раней атрыманыя веды. Пасля таго, як наведаў дзесяць лагераў, у якіх нашыя студэнты праходзілі практыку, пераканаўся, што яны паспяхова працавалі ў новай для іх якасці. Іх любілі дзеці і з павагай адносіліся адміністрацыя і калегі. Хаця, чаго граха таіць, былі і адваротныя выпадкі — нядобрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў, асабістая недысцыплінаванасць некаторых студэнтаў.

Не гледзячы на сумныя прагнозы і азначаныя цяжкасці, вучэбнаму аддзелу і кафедры педагогікі ўдалося паспяхова арганізаваць летнюю выхаваўчую практыку, хаця відавочна, што з кожным годам яе рабіць будзе ўсё складаней і складаней. І размова цяпер ідзе аб тым, яе зберагчы тое, што маем.

**А. КАРДАБНЕЎ,**
**старшы выкладчык кафедры педагогікі.**



## Ацэнку ставяць дзеці

### *ЗАМЕСТ ПРАЛОГА*

На жаль, асабістага вопыту працы ў лагеры ў мяне не было. Можа таму мне было вельмі цікава акунуцца ў атмасферу свабоды і раскаванасці, зразумець дзіцячыя забавы і трывогі. Перш за ўсё гэта была праверка сябе — ці змагу я стаць сябрам дзецям, якога яны будуць любіць і паважаць, ці змагу заваяваць іх давер? Па праўдзе кажучы, мне было страшнавата, а што, калі не зразумеюць?! І гэтая асцярога была не безгрунтоўнай, таму што мне не 14 гадоў, а я міжволі ацэньваю іх учынкі вачыма дарослага чалавека, часам кажучы каму-небудзь: «Зараз дзеці не такія, якімі былі мы».

### *ЧАКАННЕ СУСТРЭЧЫ*

з дзецьмі было хвалюючым. Адразу скажу, што планам маім не суджана было здзейсніцца, бо планавала я сустрэчу з малодшым атрадам. Хацелася звязаць назву атрада з індзейскай вольніцай, прыдумала свята свяшчэннай зямлі, выбары важака, прысвячэнне ў воіны. Прачытала літаратуру аб індзейскім быце, ведала нават некалькі слоў па-індзейску, і раптам — да мяне трапілі самыя старэйшыя. Трэба было пачынаць усё спачатку.

Трэба сказаць, што і сам лагер «Сузор´е» мне вельмі спадабаўся. Уявіце сабе добраўпарадкаваны комплекс, які складаецца з вялікага 2-павярховага будынка — цэнтральнага корпуса — з прыгожай актавай залай і сталовай і групы 2-павярховых катэджаў, якія злучаны паміж сабой дарожкамі. Размешчаны ён у прыгожым месцы, недалёка ад станцыі Парэчча. Белыя домікі катэджаў здаваліся жамчужынамі на зялёным аксаміце сасновага лесу. А калі дуў цёплы ветрык, то здавалася, што ты проста купаешся ў водары смалы і непаўторнай лясной свежасці. Уся тэрыторыя лагера услана дыванам з шышак і хвоі, дарожкі абсаджаны шыпшынай і ядлоўцавымі кустамі, а за карпусамі расцілалася люстраная гладзь Малочнага возера.



Апрача усяго, наш атрад быў і рознаўзроставым. А ўсё таму, што ў першай змене старэйшымі атрадамі немагчыма было кіраваць, таму і вырашылі ў другой змене 14-гадовых разгрупаваць па атрадах, каб пазбегнуць розных недарэчнасцей. Я лічу, што гэта не выхад са становішча. Справа ў тым, што важатаму гэта вельмі цяжка: трэба заняць і адных і другіх, ды яшчэ і праслядзіць, каб усім было цікава. Але ж тое, што цікава маленькаму, старэйшаму дзіцяці зусім не цікава, і наадварот. Праблемы 13—14-гадовых рабят зусім не прыцягваюць пяцікласнікаў.

### *ЗНАЁМСТВА*

У першую ж сустрэчу са сваімі падапечнымі загадала сабе не камплексаваць, не тушавацца, весці сябе з імі натуральна і ні ў якім разе не давіць сваім становішчам і ўладай. А потым я зразумела, што гэта было правільна.

Маю прапанову прыдумаць назву атрада рабяты сустрэлі са смяшком, з лянівым раўнадушшам, сталі прапаноўваць такія варыянты, што я нават спалохалася, што з такімі дзецьмі ў мяне нічога не атрымаецца. Зараз я разумею, што гэта быў флірт, гульня, знаёмства паміж сабой і са мной. А тады я на іх проста пакрыўдзілася, але віду не падавала. Не стала на іх давіць, а проста адпусціла пагуляць. І якой была мая радасць, калі адна з дзяўчынак запрасіла мяне ў свой пакой, дзе яна з сяброўкамі абмяркоўвала назву атрада. І тады я зразумела, што ў кожным калектыве абавязкова знойдуцца дзеці, на якіх заўсёды можна спадзявацца. У маім атрадзе іх было не так і шмат, але ішлі мы з імі побач усю змену, уцягваючы прынцыпова настроеных нічога не рабіць дзяцей і проста сарамлівых у свае справы. У канцы змены не было ні аднаго чалавека, які б дзе-небудзь не праявіў сябе. Усе мае імкненні і былі скіраваны на тое, каб дзеці звярнулі ўвагу адзін на аднаго, убачылі, што ў кожным чалавеку ёсць нешта прыгожае, каб патухлі ў іх вачах насмешкі і цынізм.

Трэба сказаць, што дзеці звярталіся да нас на Вы, але па імёнах. Дысцыпліна ад гэтага не пацярпела. Прагноз, што дзеці «сядуць нам на галавы», не апраўдаўся, а вось самі яны сталі бліжэй да нас, не было афіцыйнай халоднасці і сарамлівасці.

Адчувалася — дзеці прыехалі ў лагер з намерам добра адпачыць ад пастаяннага кантролю настаўнікаў і бацькоў (якія часам зусім забывалі, што яны былі дзецьмі), расслабіцца, адчуць сябе дарослымі і самастойнымі. А тут на табе — зноў заганяюць у рамкі, рэжымы, графікі, правілы, з якіх дзеці імкнуцца выскачыць ўсімі праўдамі і няпраўдамі. Забароны павінны існаваць, але мінімальныя, якія не ўшчамляюць свабоду дзяцей.

Ну вось і скончылася мая змена, а разам з ёй і мая летняя практыка. Зараз мне хацелася б пагаварыць аб падрыхтоўцы да яе. Спецкурс па педагагічнай практыцы, на мой погляд, трэба зрабіць больш сціснутым, больш канкрэтным. Можна даць толькі агульную характарыстыку работы ў лагеры, а больш спыніцца на вопыце былых важатых, пачуць практычныя парады, замест агульных выказванняў аб працоўным і маральным выхаванні. А вось што датычыцца інструктыўна-метадычных збораў — яны неабходныя. Калі б яшчэ іх праводзіць у лагеры — вось была б сапраўдная школа. Пажадана, каб было больш віктарын, дыскатэчных гульняў, свят і г. д. А наогул, я ў захапленні зборамі.

### *ЭПІЛОГ*

Летняя практыка ў лагеры стала для мяне цудоўным экзаменам, праверкай сіл. І хоць я больш стамілася, чым адпачыла, гэта стомленасць прыемная. Запісы дзяцей, якія яны пакінулі ў маім дзённіку на развітанне, былі больш прыемнымі, чым любы адпачынак. Яны — самая высокая ацэнка. Я і не падазравала, што так шмат зрабіла для дзяцей. Калі-небудзь я паплачу над іх запісамі. А пакуль што мне сумна, бо ўсё ўжо скончылася.

**А. ВАЛАСКОВА,**
**студэнтка 3 курса факультэта пачатковага навучання.**

# БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

*Інтэрв 'ю у нумар*

(Працяг. Пачатак на 2-й стар.).

работах, пойдуць на рахунак Фонда і тады можна будзе правесці вечар працоўнай славы, аказаць матэрыяльную дапамогу студэнтам і г. д. У мінулым годзе сямейным студэнтам мы давалі бясплатныя праяздныя білеты, мелі магчымасць на розных конкурсах, зборах узнагароджваць студэнтаў прызамі, але ў гэтым годзе такога не будзе, таму што ўсе грошы, заробленыя студэнтамі на бульбе, пойдуць на рахунак універсітэта.

Шмат праблем у Фонда, але галоўная з іх на сённяшні дзень — гэта памяшканне. Зараз усе рэчы Фонда знаходзяцца ў 216 аўд., куды культурнаму чалавеку нават сорамна зайсці, таму што яна знаходзіцца ля прыбіральні... Няма дзе паставіць стол, тэлефон, сейф, без якіх зусім нельга абыйсціся, каб не быць адарваным ад свету.

— Вось зараз думаю, каму, як не нам, патрэбны студэнты, якія зусім нядаўна прыехалі з сельскагаспадарчых работ? У мінулыя гады мы ездзілі да іх на поле, каб высветліць усе праблемы, якія іх хвалююць, адразу на месцы. Ездзілі нават у Астравец. Падтрымліваў нас таксама былы прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей Аляксандравіч Габрусевіч, які ездзіў з намі на сваёй машыне. А зараз няма бензіну. Таму прарэктар па АГР нам машыны ў гэтым годзе не даў. І засталіся студэнты са сваімі праблемамі сам-насам. Студэнты працуюць, а грошы, зробленыя імі, акрамя іх заробку, павінны калгасамі пералічвацца на рахунак універсітэта. Але калі гэту справу выпусціць з рук, не займацца ёю, то большая частка грошай проста прападзе і не дойдзе да універсітэта. Многія думаюць таксама, што шмат студэнцкіх грошай асела ў нашых кішэнях, але я хачу яшчэ раз запэўніць іх ў адваротным — усе грошы ідуць на канкрэтныя справы. У мінулым годзе В. Малышка ў нашай газеце даў падрабязную справаздачу, куды ідуць грошы з камітэта камсамола. Нікога мы не абіраем, а пра свой заробак нават гаварыць сорамна.

Займаўся камітэт камсамола, а потым і Фонд сацыяльнай абароненасці арганізацыяй летніх будаўнічых атрадаў. У мінулым годзе ў нас было 30 атрадаў, а сёлета — толькі 13. Колькасны састаў атрадаў таксама рэзка ўпаў. Былі цяжкасці ў арганізацыйным плане. Мы засталіся нікому не патрэбныя. Толькі ў пачатку мая пачалі арганізоўваць атрады. Пачаўся пошук арганізацый, людзей. Толькі ў маі пачалі праводзіць вучобу па ТБ, медагляд. Усё ж нам пашанцавала арганізаваць 13 будаўнічых атрадаў і адзін міжнародны студэнцкі атрад (ужо 2-гі раз), які працаваў на гісторыка-археалагічных раскопках ля Астрына. Дорага абышоўся нам гэты атрад, але затое цікава. Хочам выказаць падзяку сваім спонсарам: студэнцкаму прафкаму, які выдзеліў для арганізацыі міжнароднага лагера 15 тыс. рублёў, рэктарату — 5 тыс. рублёў, ВА «Азот» — 10 тыс. рублёў, а таксама Саюзу палякаў, які бясплатна выдзеліў для нас аўтобус, абласному фонду культуры, які выдзеліў для арганізацыі атрада 10 тыс. рублёў. Абяцаў дапамогу і фонд «Бацькаўшчына», але ўсё засталося толькі на словах. Думаю, што замежным студэнтам будзе што расказаць сваім сябрам.

Калі гаварыць пра нашы будатрады, то тут справа абстаіць так. Тыя студэнты, якія працавалі ў гарадскіх арганізацыях, не могуць пахваліцца сваім заробкам, рабочыя імкнуцца скарыстаць працу студэнтаў у сваіх карыслівых мэтах. Ім даюць работу, за якую менш плацяць, а самі робяць больш дарагую, бо ў іх сем 'і... А вось тыя, хто працаваў у калгасах і саўгасах, атрымалі больш, бо ўсё заробленае — іх.

Не з такой ахвотай, як у мінулыя гады, ідуць студэнты ў будаўнічыя атрады. Зараз для саміх студэнтаў не выгадна набіраць вялікія атрады, бо заробак атрымаецца меншым. Раней у нас быў нейкі стымул у рабоце. Адзін камандзір атрада 3 гады запар вазіў атрад на работу. Потым знаходзіў цікавых і дзелавых студэнтаў, якім перадаваў свой вопыт. Існавала эстафета перадачы вопыту. Потым лепшыя ўзнагароджваліся. Была ў нас задума: стварыць універсітэцкую сімволіку: ці значкі, ці шапачкі, ці майкі з эмблемамі універсітэта.

На будучае ў нас таксама шмат задумак, але праблем яшчэ больш. Дык хто ж дапаможа нам выжыць? Ці знойдуцца ў нас аднадумцы? Якім будзе зыход нашага становішча? Але ў нас яшчэ ёсць сілы для змагання. Хацелася б, каб мы былі не адныя.

**Запісала Г. КАМЕНЕВА.**

## НОВЫЯ ВЫДАННІ

Выйшлі з друку падрыхтаваныя выкладчыкамі нашага універсітэта новыя вучэбна-метадычныя дапаможнікі і распрацоўкі. Студэнтаў, а таксама слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і падрыхтоўчага аддзялення, зацікавяць выданні: **«Гісторыя Беларусі савецкага перыяду ў перыядычным друку. Бібліяграфічны паказальнік артыкулаў газет і часопісаў 1986—1991 г.г.»** і **«Гісторыя Беларусі. Метадычныя рэкамендацыі»**. Кошт аднаго экземпляра складае 15 рублёў.

Калектыў аўтараў пад рэдакцыяй Я. Піульскага выпусціў падручнік **«Паліталогія»** — коштам 10 рублёў.

Метадычная распрацоўка для студэнтаў, якія вывучаюць курс **«Асновы менеджмента»** падрыхтавана дацэнтам Ф. Марголіным. Каштуе яна 5 рублёў. А будучых матэматыкаў зацікавяць **«Метадычныя ўказанні і кантрольныя заданні па курсу «Матэматычны аналіз»**, коштам 25 рублёў.

Акрамя гэтых выданняў, Вы можаце набыць у вучэбна-метадычным аддзеле (п. 404) таксама манаграфію дацэнта **Я. Багданава «Жыллё і рынак»** (5 руб.) і **«Агляд літаратуры па лазернай фотаметрыі» С. Ануфрыка** (3 руб.).

**В. ПАЎЛЕНКА.**

## НАТАТКІ З-ЗА МЯЖЫ

*Амаль асабістае*

# У іх шмат праблем. А у нас?

### Успаміны пра мінулагоднія вандраванні

Чыгуначны вакзал у Брэсце. Стаю ў чарзе за кубачкам кавы і бутэрбродам. Стан поўнай апустошанасці. І ўжо ў каторы раз сам сабе падпяваю: «Медленно минуты уплывают вдаль, встречи с ними ты уже не жди». Якія ўсё ж сумныя словы ў гэтай дзіцячай песенцы. Прыняўшы задуменны выгляд, я падумаў: «Так, мінулага не вернеш, але ў ім можна жыць, жыць хаця б у сваіх успамінах». Стала неяк весялей ад гэтага тэатральнага выказвання і дарэмнай спробы падмануць сябе. І тут жа падумалася, што часам хочацца быць падманутым. «Ну, добра,— суцяшаю сябе,— раз нельга спыніць час і вярнуцца ў мінулае, то трэба задаволіцца ўспамінамі». І я зноў акунуўся ў тыя вераснёўскія дні.

Аб мытніцкім кантролі доўга расказваць не буду. Скажу толькі, што нашыя мытнікі ў кожным савецкім грамадзяніне, які едзе за мяжу, бачаць патэнцыяльнага махляра і жуліка. Мабыць, падобныя адносіны перадаліся і іх калегам ва Ўсходняй Германіі (выбачайце, паважаныя чытачы, але Захадам там і не пахне). Нарэшце ўсе мае дарожныя непаладкі засталіся ззаду і 6 верасня ў 10 гадзін вечара я прыбыў у Бон. Я меў буклет з інфармацыяй пра тое, што ўяўляе сабой міжнародны студэнцкі лагер і дзе ён знаходзіцца.

Першай задачай для мяне было знайсці галоўны выхад з вакзала. Раптам я сутыкнуўся з чалавекам, старым дзедам, вельмі непрыемнага выгляду, які нешта гаварыў мне па-нямецку і пры гэтым трымаў працягнутую руку, але я размаўляў толькі на англійскай мове, аб чым і растлумачыў гэтаму чалавеку. На вялікае здзіўленне, мае словы ён зразумеў і не мяняючы выразу твару ўжо па-англійску папрасіў: «Дай грошай». Калі шчыра, то я быў вельмі здзіўлены моўнымі здольнасцямі гэтага чалавека. Мне стала няёмка і я прамовіў, што я бедны студэнт з Расіі. Мабыць у гэтых словах для замежных людзей хаваецца нейкі патаемны сэнс, пра які на Радзіме я нават і не здагадваўся. А мой новы знаёмы паглядзеў на мяне з такім жалем, што я некалькі пасмялеў і вырашыў запытацца ў яго дарогі. І тут гэты чалавек з папрашайкі ператварыўся ў дабрадзея і паказаў мне ісці за ім. Ён прывёў мяне да другога такога ж дзеда і пакінуў з ім адзін на адзін. Той жа вывеў мяне да выхаду. Выказваючы падзяку, я паклаў яму ў руку наш рубель. Як высветлілася пазней, мой першы знаёмы быў «босам» п 'яніц, якія акалачваліся на вакзале. А я на асабістым вопыце адчуў, якім абаяннем і шармам валодае рускі чалавек.

І вось першая задача была выканана. Потым я па схеме знайшоў аўтобусны прыпынак, сеў у патрэбны аўтобус і паехаў. Здавалася, што да дасягнення мэты заставалася зусім няшмат, прайсці 500 метраў ад прыпынку і павярнуць два разы.

Я быў поўны аптымізму і ўспрыняў гэту прагулку па Боне не больш, чым прыемны начны мацыён (я быў па-смешнаму наіўны і нават не здагадваўся аб маіх будучых прыгодах). Так як раіла інструкцыя, я двойчы павярнуў і, думаючы, што выйшаў на фінішную прамую, бадзёра пайшоў наперад. Аднак, праз хвілін дваццаць мяне сталі мучыць сумненні. А калі праз метраў сто я выйшаў да смеццевай звалкі і паглядзеў на гадзіннік, стрэлкі якога набліжаліся да паловы дванаццатага, мой аптымізм маментальна прапаў. Я памалу пайшоў назад, намагаючыся знайсці з гэтага непрадказальнага становішча якое-небудзь выйсце. Я зноў вярнуўся на прыпынак. Думаў, што дапаможа паліцэйскі, але той пачаў выдаваць мне шквал інфармацыі на нямецкай мове. На шчасце, побач стаяла маладая пара, яна і прапанавала мне сваю дапамогу. Аказалася, што ў гэты дзень пачыналася свята Бона, і таму нават паліцэйскі ў гэтае свята мог дазволіць сабе бакал піва. Я падзякаваў маладым людзям і пайшоў на пошукі лагера. Брала злосць, што ў інструкцыі, якая была ў мяне ў руках, былі вызначаны зусім супрацьлеглыя дадзеныя. Выйшаў на шумную вуліцу, запоўненую народам, які высяліўся, мабыць, тут і быў цэнтр, дзе адзначалася гэтае свята. Але ўсё ўрэшце-рэшт калі-небудзь канчаецца. Так і маё вандраванне па незнаёмаму гораду скончылася. Вельмі стомлены, я ўсё ж дабраўся да лагера. Была ўжо гадзіна апоўначы. Вароты, зразумела, былі зачынены, і я не прыдумаў нічога лепшага, як легчы ў спальны мяшок і ўсё ж паспаць у гэтую ноч.

Першае, што ўбачыў я за варотамі, гэта шматлікія клеткі з крolікамі, загон для коней і асла, вельмі непрыгожага, а таксама драўляныя збудаванні невядомага прызначэння. Дзве дзяўчыны і юнак кармілі кролікаў. Аказалася, што дзяўчаты з Германіі, а юнак — амерыканец, які ўжо шэсць гадоў жыве ў Боне. Вось яны і з 'явяліся арганізатарамі гэтага лагера. З размовы з імі я даведаўся, што лагер заснаваны на базе «Маладзёжнай фермы». Гэта нешта падобнае да заасада, куды прыходзяць дзеці ўсіх узростаў, каб адпачыць ад бацькоў. Тут яны гуляюць, праводзяць ярмаркі па продажу кандытарскіх вырабаў, якія прыгатаваны імі, а галоўнае, адзінае месца, дзе яны могуць пазнаёміцца з жывёльным светам. Існуе «Маладзёжная ферма» на муніцыпальныя сродкі і прыватныя ахвяраванні. Задача нашага лагера заключалася ў тым, што мы павінны былі пафарбаваць знешнюю і ўнутраную сцены, упрыгожыць іх малюнкамі, каб зрабіць гэты куток яшчэ больш прываблівым для дзіцячага вока.

На працягу гэтага дня прыбылі і астатнія пяць удзельнікаў лагера: юнак і дзяўчына з Іспаніі, юнак з Шатландыі, адна дзяўчына з Бельгіі і яшчэ адна з Аўстрыі. Гэты дзень стаў пачаткам двухтыднёвага міжнароднага студэнцкага лагера ў Боне. За гэты час мы навучыліся разумець адзін аднаго. Ужо на наступны дзень мы знаёміліся з горадам. Гэта невялікі, але вельмі ўтульны горад, дзе жыве крыху больш 300 тыс. людзей. У Боне амаль няма высотных дамоў. Невысокія, але арыгінальныя агародзікі і незвычайная для рускага чалавека чысціня і акуратнасць ва ўсім надаюць гораду асаблівую прываблівасць. Спынюся на тым, што можа зацікавіць дапытлівага чытача. Хачу заўважыць, што немцы амаль ва ўсім бачаць праблему: то хто і што будзе рабіць сёння, то як правесці вольны час. У першы ж дзень мы абмяркоўвалі транспартную праблему ў Боне, але, шчыра кажучы, ніякай праблемы ў гэтым я не бачыў. Абмяркавалі мэты стварэння міжнародных студэнцкіх лагераў і паслухалі гісторыю гэтага руху. Наведалі мы і незвычайны дзіцячы сад, які адрозніваўся ад звычайнага тым, што летам дзецям дазвалялі бегаць голенькімі, а на працягу ўсяго года ім дазвалялася не згаджацца з думкамі выхавацеля і ўсё рабіць як ім захочацца. Пасля наведвання жаночага музея, пасля ўбачаных там экспанатаў, мы яшчэ доўга спрачаліся аб непаўнапраўным становішчы жанчын і мужчын у сучасным свеце.

У апошні дзень мы абмяркоўвалі пытанне утылізацыі прамысловых адходаў. На пытанне аб тым, як вырашаецца гэта праблема ў СССР, я адказаў, што СССР настолькі вялікая краіна, што можа дазволіць сабе мець звалку для смецця, якая па плошчы роўная ўсёй аб 'яднанай Германіі. Як бачыце, у немцаў шмат праблем і вострых пытанняў.

Хачу заўважыць, што ўдзельнікі лагера надавалі мне асаблівую ўвагу. Для іх я быў незвычайным рускім. Дарэчы, можна сказаць, што ў Боне, як і ва ўсёй Германіі, даволі часта праходзяць гастролі нашых вядомых спевакоў і акцёраў, дні рускай культуры і г. д. Якраз у гэтыя дні ў Бон прыехаў Аляксандр Градскі. Я не мог страціць такі шанц і без асаблівых намаганняў угаварыў сяброў пайсці на канцэрт гэтага цудоўнага спевака і кампазітара. На жаль, крыху непрыемны асадак застаўся ў маёй душы пасля размовы з кампазітарам, але не пасля яго песень. У маёй душы прачнулася дзіцячае жаданне пагаварыць са знакамітым чалавекам. Я са сваім сябрам падышоў да яго. «Якія песні будзеце Вы выконваць сёння? Са старога ці з новага рэпертуару? — спытаў я. А ён неяк абыякава: «З якога прыйдзецца». Я пераклаў яго адказ сябру і папрасіў яго задаць гэта ж пытанне на англійскай мове. На маё вялікае здзіўленне, Градскі падараваў іспанцу некалькі хвілін, адказваючы яму. Мяне вельмі абразілі адносіны спевака да свайго суайчынніка за мяжой. Але песні крыху растапілі маю душу і загладзілі рану.

Адносіны з сябрамі складваліся добра, моўнага бар 'еру я не адчуваў, за выключэннем шатландца з яго акцэнтам. Таму на ўсе яго пытанні я вырашыў адказваць «Ес!». Мяне часам здзіўлялі паводзіны Эндзі, так звалі гэтага шатландца. Калі аднойчы за абедам ён спытаў, ці збрыў я сёння бараду, я, не зразумеўшы яго пытання, як і звычайна адказаў: «Так». Ён неяк незвычайна паглядзеў на мяне. А навошта пытаць, калі сам бачыш, што не збрыў (я забыў дома брытву)? Ён вёў сябе какетліва, як дзяўчына, хадзіў, плаўна паводзячы бёдрамі. 1 мая здагадка падцвердзілася, калі Эндзі расказаў мне гісторыю свайго кахання. Ён быў гомасексуалістам.

Два тыдні праляцелі вельмі хутка. Трэба збірацца дадому. Убачыўшы мае сумныя вочы, дзяўчаты Мар і Улі (іспанка і немка), прапанавалі мне застацца яшчэ на некаторы час на ранчо мексіканца, які купіў надзел зямлі ў Германіі. Мы паілі і кармілі коней гаспадару, за што ён нас карміў і забяспечваў дахам над галавой. Вечарамі да нас прыходзілі работнікі «Маладзёжнай фермы» для таго, каб пасядзець ля агню і проста пагаварыць.

Да Берліна са мной ехала Мар. Там, недалёка ад чыгуначнага вакзала, мы наведалі рускі рэстаран пад назвай «ГУМ». Мне было прыемна чуць знаёмую мову, нашыя песні. На развітанне я падараваў бармэну кавалак чырвонага сітцу з сярпом і молатам. Гэта яго так кранула, (сапраўдны рускі наведаў яго рэстаран) і ён не браў з нас плату за рускую водку.

Трапіўшы на свой чыгуначны вакзал, я апынуўся ў натоўпе пацыфістаў, якія выступалі супраць распараджэння ўрада аб адпраўцы войск (куды — я так і не даведаўся). Зразумеўшы, што я не немец, яны вырашылі прыцягнуць увагу і сусветнай грамадскасці, яны акружылі мяне, спрабуючы мне нешта растлумачыць. Тут жа з 'явіліся і кінакамеры, а за імі і паліцэйскія. З вялікай цяжкасцю мне ўдалося вызваліцца з гэтага натоўпу і дабрацца да цягніка, дзе я з палёгкай размясціўся на сваім месцы.

Гэта быў мой апошні дзень у Германіі...

... Чыгуначны вакзал у Брэсце. Стаю ў чарзе за кубачкам кавы і бутэрбродам. Стан поўнай апустошанасці.

**А. ЛЕХ,**
**студэнт V курса гістарычнага факультэта.**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы ў месяц
Аб 'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15 00.

Наклад 2 000 экз. Зак. 4499

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

*В. а. рэдактара Л. М. МАНЦЭВІЧ*